УСТАНОВА “БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ-МУЗЕЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА”

**КУДРЭВІЧ УЛАДЗІМІР МІКАЛАЕВІЧ**

**МАСТАК-ЖЫВАПІСЕЦ, ЗАСЛУЖАНЫ ДЗЕЯЧ МАСТАЦТВАЎ БССР**

**13 (25) ЛІСТАПАДА 1884 Г. – 4 СТУДЗЕНЯ 1957 Г.**

**КУДРЭВІЧ УЛАДЗІМІР УЛАДЗІМІРАВІЧ**

**АКЦЁР, ЗАСЛУЖАНЫ АРТЫСТ БССР (СЫН)**

**2 МАЯ 1927 Г. – 15 ЛЮТАГА 2003 Г.**

**ФОНД № 230**

**ВОПІС № 1**

**1942–1977 гг.**

**МІНСК 2024**

# ЗМЕСТ

**да воп. № 1 ф. 230**


| №№ | Назва раздзелаў | № спраў | № стар. воп. |
|---|---|---|---|
| | ПРАДМОВА | | |
| 1. | ДАКУМЕНТЫ У.М. КУДРЭВІЧА (БАЦЬКІ) | 1-5 | 1 |
| 2. | ДАКУМЕНТЫ У.У. КУДРЭВІЧА (СЫНА) | 6-20 | 1-4 |
| 2.1. | ФАТАГРАФІІ У.У. КУДРЭВІЧА Ў РОЛЯХ І СЦЭНАХ З СПЕКТАКЛЯЎ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ТЭАТРА ІМЯ Я. КУПАЛЫ | 6-15 | 1-3 |
| 2.2. | ДАКУМЕНТЫ ДА БІЯГРАФІІ У.У. КУДРЭВІЧА | 16-20 | 3-4 |

## Прадмова

**Кудрэвіч Уладзімір Мікалаевіч** нарадзіўся 13 (25) лістапада 1884 г. у мястэчку Чавусы Магілёўскай губерні, Расійскай імперыі (цяпер г. Чавусы Магілёўская вобласць, Рэспубліка Беларусь) у сям'і начальніка паштовага аддзялення. У двухгадовым узросце застаўся сіратою, выхоўваўся ў чужой сям'і. Пасля сканчэння царкоўна-прыходскай школы вучыўся ў чатырохкласным павятовым вучылішчы (1898–1902). У 1902 г. пайшоў на службу ў Чавускую паштова-тэлеграфную кантору і, амаль адразу, быў пераведзены ў Гомель на пасаду тэлеграфіста Лібава-Роменскай чыгункі. У 1903–1906 гг. У.М. Кудрэвіч вучыўся ў мастацкім вучылішчы горада Лібавы (цяпер Ліепая, Латвія) у майстэрні іканапісца С.П. Васільева. Падчас вучобы ў Лібаве ў Кудрэвіча выявіўся акцёрскі талент. З 1907 г. ён іграў на сцэне, выконваў пераважна камедыйныя ролі. У 1915 г. У.М. Кудрэвіч пераехаў у Мінск. Пасля кастрычніка 1917 г. ён працаваў загадчыкам клуба імя У.І. Леніна Заходняй чыгункі, адначасова кіраваў мастацкай студыяй, выступаў на сцэне клуба ў якасці акцёра, выконваў абавязкі рэжысёра і дэкаратара спектакляў. У 1920-х гг. займаўся педагагічнай дзейнасцю, актыўна ўдзельнічаў у мастацкім жыцці краіны, працаваў над новымі карцінамі. У 1941–1944 гг. жыў у эвакуацыі. Спачатку ў в. Мартынаўка Арэнбургскай вобласці, а з 1943 г. – у Кемерава, дзе ўзначаліў аддзяленне Саюза савецкіх мастакоў. З 1944 года жыў і працаваў у Мінску. Член Саюз мастакоў БССР з 1940 г. Член праўлення Саюза савецкіх мастакоў БССР (1944–1948). Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР (1944). Узнагароджаны двума ордэнамі "Знак Пашаны" (1944), (1949), медалём "За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гг." (1945).

Удзельнік мастацкіх выставак з 1921 г. Працаваў пераважна ў жанры пейзажа. Асноўныя творы: "Стары Мінск" (1921), "Раніца вясны" (1924), "Млын" (1925), "Беларуская вёска" (1925), "Над Свіслаччу" (1927), "Раніца" (1927),"Паглыбленне Арэсы" (1934), "Паром на Дзвіне" (1934), "Экскаватар на асушцы" (1938–1939), "Набліжэнне навальніцы" (1939), "БелДРЭС" (1940), "Зіма на Мінскім возеры" (1940), "БелДРЭС" (1940), "Па дарогах вайны" (1945), "На рацэ Сож" (1945), "Раніца на Дняпры" (1945), "Квітнеючы луг" (1947), "Пасля дажджу" (1947), "Бярозкі" (1948), "Пачатак вясны" (1948), "Беларускі пейзаж" (1949), "Свіслач" (1952), "Вясновы матыў" (1952), "Дубы" (1953), "Вечар на возеры Палік" (1953), "Жыта", "Раніца", "Лясная рэчка"(усе 1956) і інш. Творы У.М. Кудрэвіча знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь, фондах Беларускага саюза мастакоў і БДАМЛМ.

Памёр Уладзімір Мікалаевіч Кудрэвіч 4 студзеня 1957 г. Пахаваны ў Мінску.

**Кудрэвіч Уладзімір Уладзіміравіч** нарадзіўся 2 мая 1927 г. у Мінску ў сям'і мастака Уладзіміра Мікалаевіча Кудрэвіча. У 1946–1948 гг. вучыўся ў

тэатральнай студыі пры Беларускім тэатры імя Я. Купалы, кіраўніком якой быў Е.А. Міровіч. Вучыўся ў Л.М. Літвінава і В.У. Галіны. Вучоба ў студыі праходзіла з практыкай на сцэне. Пасля сканчэння навучання быў залічаны ў акцёрскі штат Беларускага дзяржаўнага тэатра імя Я. Купалы. Творчае жыццё У.У. Кудрэвіча пачалося з увасаблення розных па характары вобразаў і ў спектаклях розных жанраў: Пётр (“Апошнія” М. Горкага), граф Парыс (“Рамэо і Джульета” У. Шэкспіра), Сырамятаў (“Жаніцьба Бялугіна” А.М. Астроўскага і М. Салаўёва), Якім Сарока (“Паўлінка” Я. Купалы), Юліус Фучык (“Прага застаецца маёй” Ю.А. Буракоўскага). Адметнымі сталі ролі ў пастаноўках сучаснай драматургіі: Пётр Сабейкін (“Стары Новы год” М.М. Рошчына), Павел Козін (“Традыцыйны збор” В.С. Розава), Іван і Мацей Худзякоў (“Характары” паводле В.М. Шукшына), Мікола Верас і Дажывалаў (“Пяюць жаваранкі”, “Брама неўміручасці” К. Крапівы), Хведар (“Вежа” А.А. Дударава і У.П. Някляева), Янка Саўскі (“Там і тут” Д. Кавачэвіча). Галерэю яркіх вобразаў стварыў у п’есах А.Я. Макаёнка: Цесакоў (“Лявоніха на арбіце”), Сырадоеў (“Трыбунал”), Клёпкін (“Пагарэльцы”). Майстэрства сцэнічнай мініяцюры праявілася ў спектаклях паводле празаічных твораў: Сідар Раўнягін (“Плач перапёлкі” І.Г. Чыгрынава), Зыкін (“Бераг” паводле Ю.В. Бондарава), Іона (“Закон вечнасці” паводле Н. Думбадзе), Жогла (“Апошні журавель” А.А. Дударава і А.А. Жука). Сярод іншых роляў: Лявон Адзінец (“Рудабельская рэспубліка” С.І. Грахоўскага, Т.А. Абакумоўскай, Б.І. Луцэнкі), Ляпкін-Цяпкін (“Рэвізор” М. Горкага), Шаргаёў (“Парог” А.А. Дударава), Пустарэвіч (“Паўлінка” Я. Купалы), Макарычаў (“Залатая карэта” Л.М. Лявонава), Раман (“Дзеці сонца” М. Горкага),Ураднік (“Памінальная малітва” Р.І. Горына паводле Шолам Алейхема), Бадаеў (“Лес” А.М. Астроўскага), Зуёнак (“Страсці па Аўдзею” У.П. Бутрамеева), Цесць (“Дом на мяжы” С. Мрожака). Заслужаны артыст БССР з 1976 г.

Памёр Уладзімір Уладзіміравіч Кудрэвіч 15 лютага 2003 г. і пахаваны ў Мінску.

Дакументы бацькі і сына Кудрэвічаў паступілі ў БДАМЛМ ад Уладзіміра Уладзіміравіча Кудрэвіча ў 1978 г.

У выніку навукова-тэхнічнай апрацоўкі быў складзены вопіс № 1 у колькасці 20 спраў (104 дакументы) за 1942–1977 гг. Вопіс складаецца з двух раздзелаў.

Першы раздзел складаецца з дакументаў У.М. Кудрэвіча (бацькі). Гэта тры пейзажныя эцюды (1942–1950), ганаровая грамата (1948) і юбілейныя віншаванні (1954).

Другі раздзел уключае дакументы У.У. Кудрэвіча (сына) і падзяляецца на два падраздзелы. Першы – гэта фатаграфіі У.У. Кудрэвіча ў ролях і сцэнах з спектакляў Беларускага дзяржаўнага тэатра імя Я. Купалы (1948–1975). Другі – дакументы да біяграфіі У.У. Кудрэвіча (праграмы спектакляў Беларускага

дзяржаўнага тэатра імя Я. Купалы (1948–1970), ганаровыя граматы (1968–1969), віншаванні з прысваеннем ганаровага звання “Заслужаны артыст БССР” (1976), аўтабіяграфія (1978), выразкі з газет з артыкуламі са згадкамі У.У. Кудрэвіча (1950–1977).

Прадмову склала
вяд. архівіст Г.Б. Багамолава
29.04.2024

Беларускі дзяржаўны архіў-музей
літаратуры і мастацтва

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пратакол ЭМК БДАМЛМ
ад 27.03.2024
№ 3

ФОНД № 230
ВОПІС № 1
1942 - 1977

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **1. ДАКУМЕНТЫ У.М. КУДРЭВІЧА (БАЦЬКІ)** | | | | |
| 1 | У.М. Кудрэвіч. "Ст. Сарай-Гир. Утро". Эцюд. Папера, акварэль | 1942 | 1 | 1 | |
| 2 | У.М. Кудрэвіч. Восеньскі пейзаж. Эцюд. Кардон, алей | 1944 | 1 | 1 | |
| 3 | У.М. Кудрэвіч. Зімовы пейзаж. Эцюд. Холст на кардоне, алей | 1950 | 1 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 4 | Ганаровая грамата Камітэта па справах мастацтваў пры Савеце Міністраў СССР, ЦК прафсаюза работнікаў мастацтва СССР, Цэнтральнай ваенна-шэфскай камісіі за заслугі ў галіне культурнага шэфства над узброенымі сіламі СССР на імя У.М. Кудрэвіча | 1948 | 2 | 1 | |
| 5 | Віншаванні Дзяржаўнай карціннай галерэі БССР, Праўлення саюза савецкіх архітэктараў Беларусі, Саюза савецкіх пісьменнікаў БССР У.М. Кудрэвічу з 70-годдзем з дня нараджэння і 50-годдзем творчай працы. Л. 2 - фатаграфія У.М. Кудрэвіча, на л. 4 - аўтографы беларускіх пісьменнікаў: А.П. Астрэйкі, Я. Брыля, А.С. Вялюгіна, П.Ф. Глебкі, К. Крапівы, Я. Маўра, І.П. Мележа, П.Е. Панчанкі, І.П. Шамякіна і інш. | 1954 | 4 | 3 | |
| | **2. ДАКУМЕНТЫ У.У. КУДРЭВІЧА (СЫНА)** | | | | |
| | **2.1. ФАТАГРАФІІ У.У. КУДРЭВІЧА Ў РОЛЯХ І СЦЭНАХ З СПЕКТАКЛЯЎ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ТЭАТРА ІМЯ Я. КУПАЛЫ** | | | | |
| 6 | Фатаграфіі У.У. Кудрэвіча ў ролі Пятра ("Апошнія" М. Горкага) і сцэны з гэтага спектакля з удзелам Б.У. Уладамірскага ў ролі Івана Каламійцава). Выпускны спектакль тэатральнай студыі. Фатаграфія У.У. Кудрэвіча ў групе з артыстамі і кіраўнікамі тэатральнай студыі Беларускага дзяржаўнага тэатра імя Я. Купалы. | 1948 | 3 | 3 | |

| №№ п/п | Загалоўкі справаў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Копіі | | | | |
| 7 | Фатаграфіі У.У. Кудрэвіча ў ролях Бряша ("Шлюб па сакрэту" Кальмана старэйшага і Д. Гарыка) і П.Г. Грабёнкіна ("Сям'я Лутоніных" братоў Тура і І. Пыр'ева), (рэж. К.Н. Саннікаў, у ролі Пятра Сабейкіна ("Стары Новы год" М. Рошчына), (рэж. А.Ф. Андросік) і сцэны з гэтых спектакляў з удзелам З.І. Браварскай (у ролі Варвары), Б.К. Кудраўцава (у ролі Калмыкова), Л.В. Чыжэўскай (у ролі Агніі) і інш.<br>Копіі | 1950, 1957, 1974 | 7 | 7 | |
| 8 | Фатаграфіі У.У. Кудрэвіча ў ролях Аляксея ("У добры час", В. Розава, рэж. Л.І. Мазалеўская), Баіра ("Цудоўны скарб" П. Малярэўскага, рэж. Л.Р. Рахленка), Зюбіна ("Пратакол аднаго пасяджэння" А. Гельмана, рэж. Б.У. Эрын), Сырамятава ("Жаніцьба Бялугіна" А. Астроўскага, рэж. Я.А. Громаў) і інш.<br>Арыгіналы і копіі | 1949-1957, 1963-1975 | 13 | 13 | |
| 9 | Фатаграфіі з рэпетыцыі і сцэн з спектакля "Прага застаецца маёй", пастаўленага У.В. Кухтам па п'есе Ю. Буракоўскага з удзелам У.У. Кудрэвіча (у ролі Юліуса Фучыка), Т.Н. Аляксеевай (у ролі Густы), П.І. Іванова (у ролі Ёзэфа Пешэка), З.Ф. Стомы (у ролі Йіржы).<br>Копіі | 1952 | 6 | 6 | |
| 10 | Фатаграфія акцёраў (Т.Н. Аляксеевай, М.М. Зінкевіч, Я.А. Кавалёвай, К.К. Сянкевіча і інш.) пасля спектакля "Аленькая кветка", пастаўленага рэж. І.Ф. Ждановічам па п'есе І. Карнаухавай і Л. Браўсевіча паводле казкі А. Аксакава.<br>Копія | 1953 | 1 | 1 | |
| 11 | Фатаграфіі сцэн з спектакляў "Пяюць жаваранкі" К. Крапівы і "Цытадэль славы" К. Губарэвіча, пастаўленых рэж. К.Н. Саннікавым, "Пабег" Д.А. Шчаглова, пастаўленага рэж. У.В. Кухтам і С.С. Бірылам і інш. з удзелам У.У. Кудрэвіча (у ролях Вераса, П. Вінакурава, Міколы, Наганава), Е.В. Рынковіч (у ролі Варвары) і інш.<br>Копіі | 1950-1951 | 5 | 5 | |
| 12 | Фатаграфіі сцэн з спектакляў "Таблетку пад язык", пастаўленага рэж. Б.І. Луцэнкам па п'есе А.Я Макаёнка з удзелам У.У. Кудрэвіча (у ролі Скаромнага), В.С. Белахвосціка (у ролі У.А. Каравая), А.В. Луцэвіча (у ролі Паляніцы), | 1964-1974 | 4 | 4 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | "Традыцыйны збор", пастаўленага рэж. Б.І. Луцэнкам па п'есе В.С. Розава з удзелам У.У. Кудрэвіча (у ролі Паўла Козіна) і інш. Копіі | | | | |
| 13 | Фатаграфіі У.У. Кудрэвіча ў неўстаноўленых ролях і з неўстаноўленых спектакляў. Арыгіналы і копіі | [к. 1940-х-пач. 1950-х гг.], [1960-я-1970-я г.] | 11 | 11 | |
| 14 | Фатаграфіі сцэн з кінафільма "Запомни этот день" ("Беларусьфільм"), пастаўленага У.У. Корж-Саблінам з удзелам У.У. Кудрэвіча (у ролі ямшчыка Ясеня), У.В. Белакурава (у ролі Равінскага), М.М. Яроменкі старэйшага (у ролі Ясеня) | 1967 | 2 | 2 | |
| 15 | Фатаграфіі з кінапроб У.У. Кудрэвіча ў неўстаноўленых фільмах. Фатаграфія У.У. Кудрэвіча на здымках неўстаноўленага кінафільма ў групе з К.С. Лучко і інш. | [1960-я - 1970-я гг.] | 4 | 4 | |
| | **2.2. ДАКУМЕНТЫ ДА БІЯГРАФІІ У.У. КУДРЭВІЧА** | | | | |
| 16 | Праграмы спектакляў Беларускага дзяржаўнага тэатра імя Я. Купалы: "Апошняя ахвяра" А.М. Астроўскага (рэж. Ц.А. Кандрашоў), "Гэта было ў Мінску" А. Кучара (рэж. К.Н. Саннікаў), "Калінавы гай" А.Е. Карнейчука (рэж. П.М. Сушко), "Прага застаецца маёй" Ю. Буракоўскага (рэж. І.Я. Судакоў) і інш. З удзелам У.У. Кудрэвіча. Запрашэнне Урада БССР на прыём у сувязі з 50-годдзем Беларускага тэатра імя Я. Купалы на імя У.У. Кудрэвіча | 1948-1970 | 31 | 15 | |
| 17 | Ганаровыя граматы Магілёўскага абласнога ўпраўлення культуры і абкома прафсаюза работнікаў культуры, Малдаўскага рэспубліканскага камітэта прафсаюза работнікаў культуры за высокае выканаўчае майстэрства на імя У.У. Кудрэвіча | 1968-1969 | 3 | 2 | |
| 18 | Віншаванні ад Міністра культуры БССР Ю.М. Міхневіча, рэжысёра Б.У. Эрына і Беларускага тэатральнага аб'яднання У.У. Кудрэвічу з прысваеннем яму ганаровага звання "Заслужаны артыст БССР" | 1976 | 4 | 3 | |
| 19 | Аўтабіяграфія У.У. Кудрэвіча. Аўтограф | 1978 | 6 | 1 | |
| 20 | С.С. Бірыла "Чувство правды", М.І. Гамолка | 1950-1977 | 20 | 20 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | "Цытадэль славы", У. Мехаў "Павел Козін", У.І. Няфёд "Прага остаётся моей", "Спектакль аб юнацтве правадыра", Р.В. Шкраба "Вялікае жыццё" і інш. Артыкулы пра спектаклі Купалаўскага тэатра ў 1950-х - пач. 1960-х гг. і інш. са згадкамі У.У. Кудрэвіча. Выразкі з газет | | | | |

У дадзены вопіс унесена 20 (дваццаць)
спраў з № 1 па № 20 , 104 дакументаў.

Вопіс склала і апрацоўку фонда зрабіла:

вяд. архівіст ____________________ Г.Б. Багамолава

2024

Дакументы прынялі:

заг. аддзела забеспячэння
захаванасці дакументаў ____________________ В.І. Бярэйшык

"_____"____________20____ г.